*Абласны цэнтр*
*Народнай творчасці*

# Спас – усяму час

*метадычны дапаможнік па святкаванню Спаса*

*Мінск 1994*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЎТАРЫ: П.А. Гуд**

**Н.І. Гуд**

**К.М. Пятровіч**

**Рэдактар: С.У. Кліменценка**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спас на Беларусі

Восень – самая доўгачаканая для земляроба пара года: час завяршэння ўборкі ўраджаю, збору дароў прыроды – грыбоў, арэхаў, ягад.

Беларусы, як адзначаецца ў адным з ранніх этнаграфічных даследванняў, "пачынаюць адлічваць восеньскі час звычайна ад Іллі: ёсць прымаўка, што на Іллю да абеду лета, а пасля абеду - восень". (К. Фалютынскі, с.85) Гэты дзень быў днём паварота да восені. "Ілля жніво пачынае, а лета канчае".

ЖНІВЕНЬ… У беларусаў, па старажытнай традыцыі, святы гэтага месяца звязаны з першым грамадскім ужываннем сельскагаспадарчых прадуктаў і уяўлялі перапляценне язычніцкіх, хрысціянскіх і народных звычаяў і абрадаў, гістарычных падзей. Усе гэтыя праявы духоўнага жыцця адлюстроўваюць лёс і жывяць гістарычную памяць народа.

У славян гэты месяц меў многа народных назваў: серпень і жнівень – ад разгару жніва, касач – ад касы, касавіцы траў, зарев – ад яркіх і халодных досвіткаў. Назва "август" зацвердзілася ў гонар рымскага імператара АўгустаІ прыйшла на Русь з Візантыі.

У жніўні сяляне і касілі, і аралі, і сеялі, таму ім вельмі важна было ведаць народныя метэаралагічныя прыкметы.

Заснаваныя на векавых назіраннях, доўгатэрміновыя прагнозы народнай метэаралогіі неабходна ведаць і сучасным культработнікам з тым, каб загадзя планаваць правядзенне жнівеньскіх святаў, у залежнасці ад кліматычных умоў, на вольным паветры ці ў закрытым памяшканні.

Надвор'е жніўня ў нейкай ступені вызначаў Самсонаў дзень – 27 чэрвеня (10 ліпеня): "На Самсона дождж – да бабінага лета мокра будзе", а ўборка зерневых культур будзе цяжкая, пад моцныя ліўні. Пры непагадзі на Самсонаў дзень чакалі таксама дажджу праз сем тыдняў, у сярэдзіне жніўня на трэці спас – спасаўскія дзяды – 16 (28) жніўня.

Асабліва важная прыкмета восені прымяркоўвалася да 19 ліпеня (1 жнівеня) на Макрыды: "Глядзі восень па Макрыдзе: Макрыда мокрая – і восень мокрая".

Зажынкі – абрадава-рытуальнае афармленне пачатку жніва – беларусы звычайна пачыналі на Іллю – 20 ліпеня (2 жніўня). "Святы Ілля – слаўная жняя", "Святы Ілля копы лічыць". Але ў залежнасці ад розных кліматычных умоў і тэрмінаў выспявання жыта, ў розных раёнах Беларусі зажынкі мелі розныя даты святкавання, таму пачатак жніва на Іллю нельга лічыць 'агульнанацыянальнай з'явай.

Першае восеньская сята – Спас – сваімі каранямі сягае ў старажытны звычай зняцця таб (забароны) на ўжыванне першых пладоў і ўрачыстае, звычайна калектыўнае адведванне іх. Есці плады да Спаса людзі баяліся, таму што "зазнаўшы іх падвяргаецца страўнікавым хваробам" (Ю. Крачковский, ст. 152). Забарона мела падставу ў рэальных жыццёвых назіраннях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

земляробаў. Пазней гэтае табу знайшло пераасэнсаванне ў царкоўнай легендзе, згодня якой Бог, які раздаваў дзецям райскія яблычкі, не адорваў імі тых дзяцей, чыя маці ўжывала іх да свята.

Час Спаса лічыўся сялянамі адзіна законным тэмінам для ўжывання многіх пладоў: "Прыйшоў Спас – усяму час". Першапачатковая назва дзён рытуальнага калектыўнага ўжывання пладоў была забыта, і сам тэрмін – Спас – свята атрымала пад уплывам хрысціянскай царквы ў гонар Хрыста.

Усходнеславянскі Спас меў тры тэрміны святкавання – 1 (14), 6 (19) і 16 (28) жніўня.

ПЕРШЫ СПАС – 1 (14) жніўня атрымаў назву Маккавеі (у простанароддзі - Макавей), гэта значыць "паходжанне", альбо "исхождение" крыжа. Сама назва гаворыць аб зліцці ў  гэтым свяце хрысціянскіх і язычніцкіх, гістарычных і народных традыцый. Прыйшоўшы з Візантыі абрад вынасу часткі крыжавога дрэва з палаца ў царкву Сафіі і асвяшчэнне вады, каб пасланць дождж на зямлю ў час засухі і ачысціць горад ад злых духаў, на Русі трансфармаваўся ў чын "водаасвяшчэння". На рэках, азёрах, вадаёмах ладзілі крыжовыя ходы, вада асвяшчалася, пасля чаго ўсе купаліся ў гэтай вадзе і купалі скаціну – для ачышчэння ад нячыстай сілы і перасцярогі ад хвароб.

На Беларусі першы Спас лічыўся святам праводзін лета, да якога хрысціянская царква прымеркавала дзень памінання ветхазаветных пакутнікаў Макавеяў.

Розныя ўсходнеславянскія народы мелі некаторыя адметнасці ў традыыях святкавання першага Спаса: калі ў рускіх у гэты час пачыналася ўжыванне мёду (адкуль Спас і атрымаў назву "мядовы"), то ў беларусаў у гэты час сяляне асвячалі ў царкве мак, садовыя кветкі і некаторыя агародныя культуры (моркву, сланечнікі), а таксама жыта (Романов Е.Р. – с.274).

Традыцыйнай стравай першага Спаса былі пірагі з морквай і, асабліва, з макам, гатавалі таксама варэнікі з мёдам, а на Віцебшчыне – living рознае мачанне: у пражаніну мачалі бліны, у мёд – хлеб і агуркі.

З пешым Спасам звязана многа павер'яў, прыкмет, рытуалаў. На Тураўшчыне асвячоным макам асыпалі хату ад нябожчыкаў, а калі ішлі на суд, то абсыпалі кругом сябе. НаБрагіншчыне дзяўчаты на Макавея праводзілі варажбу, у час якой прыгаворвалі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала" (Лозна А., с.143).

Былі і Макавееўскія прыкметы: "Калі на Макаўе не бывае дажджу, будзе шмат камароў. А як на Юр'е дождж – будзе рыбы многа, а на Макавея – будзе многа грыбоў" (Дембовецкий А.С., с.384). У народзе лічылі, што ў жніўні, пераважна на спасаўку, павінна прайсці так званая Рабінавая ці Вераб'іная ноч. На працягу яе грымоты скаланаюць неба, грозна бліскаюць маланкі, лье праліўны дождж, дзьме вецер. Згодна з народнымі павер'ямі, у гэтымі павер'ямі, у гэтую ноч на свет выходзяць усе злыя сілы, якія нібы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спраўляюць сваё галоўнае гадавое свята і страшаць хрышчоных людзей. Паводле іншых меркаванняў, усе сілы прыроды ядналіся, каб знішчыць "нячыстую сілу", што расплядзілася пасля Купалля і шкодзіла людзям. Забіты ці пкалечаны Перуном у Рабіную ноч лічыўся чараўнікам. На Палессі гаварылі, што ад такой моцнай буры рабчыкі разлятаюцца па ўсім лесе і да самага танавання жывуц па аднаму.Лічылі, што неспакойная ноч спрыянню ягад на рабіне. Калі ж ягады не спелі, чакалі благога заканчэння лета і халоднай восені (Васілевіч У., ст.42).

На спасаўку пачынаўся двухтыднёвы пост (15 дзён да 28 жніўня), у час якога забаранялася есці тлустую ежу. У народзе гэты пост атрымаў назву "спасаўка-ласаўка", бо можна было ў волю ад'есціся маку, пірагоў, гародніны. У Лельчыцкім раёне ў першы панядзелак Спасаўкі пяклі пячэнне "жужыкі" па колькасці душ у сям'і, мачалі яго ў мёд, потым у попел. Каб пазбегнуць сустрэчы са змеямі, трэба было сказаць: "Лучшэй буду дужыкі ў попел мачаць, чым на сабе мохлю (змяю) дзяржаць" (А.Лозпа, с.145).

Раслінам, асвяшчоным у царкве (кветкі, зёлкі), прыпісвалі гаючую сілу: макам абсыпалі хлявы, а кветкі кідалі ў ваду і купалі ў ёй хворых дзяцей (Романов Е., с.274). Некаторыя гаспадары стараліся ў гэты дзень пачаць сяўбу і з надзеяй на шчодры ўраджай будучага года праводзілі магічныя абрады. Так, у Смаленска губерніі напярэдадні асвячэння насення ў царкве гаспадары варылі столькі яек, колькі мужчын у сям'і: за абедам кожны разбіваў яйка, і у каго яно было паўней, той павінен быў засяваць жыта, каб ураджай быў добры (Неверович В., с.164). Гэтым дзеяннем сяляне імкнуліся перадаць зямлі ўрадлівую сілу яйка з тым, каб была багатай наступная хлебная страда.

<u>ДРУГІ СПАС</u> – вялікі, або яблычны – час масавага выспявання яблык, які святкавалі 6 (19) жніўня, з'яўляецца земляробчым святам садавіны. У гэты дзень сяляне таксама падгядалі пчол і выбіралі з вулікаў мёд. Адгалоскам старажытнай традыцыі калектыўнага ўжывання прадуктаў з'явіўся зажаваўшыся ў гэты час на Беларусі звычай бонды – ўзаемадапамогі, частавання сваякоў і аднавяскоўцаў садавінай, хлебам, мёдам і г.д.

На другі Спас пчаляр частаваў мёдам родных і тых, хто прыходзіў на пасеку (Романов Е.Р., с.274).

Згодна з павер'ем, калі пчаляр пашкадуе ў гэты дзень мёду хоць аднаму з прысутных дзяцей, пчолы прападуць (Васілевіч У., с.43).

На спасаўскі стол у гэты дзень падавалі абрадавую страву – пірагі з яблыкамі.

Другі Спас быў не толькі святам садавіны, але і святам сустрэчы восені. Гэты дзень у народзе лічылі днём адлёту ў вырай буслоў, з якімі былі звязаны наступныя прыкметы: калі буслы збіраліся ў чароды за тыдзень перад Спасам, гэта азначала надыход ранняй і марознай зімы і цёплай вясны; калі пасля Спаса – цёплая ласкавая восень, то будзе мяккая зіма і халодная вясна. Буслы на сваіх крылах неслі ў вырай лета, якое саступала месца восені.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Пыйшоў Спас – і лета ад нас”, “Першы і другі Спас – бяры рукавічкі ў запас”, “Спас – лета шась”.

Царква прымеркавала да дня калектыўнага ўжывання садавіны і сустрэчы восені хрысціянскае свята “Ператварэнне Хрыста” і надала яму рэлігійнае значэнне: у храмах асвячалі дары восені – яблыкі, слівы, грушы, зерне. У многіх мясцінах пасля асвячэння ў царквах людзі неслі яблыкі на могілкі, дзе клалі ўсёй радне ра яблычку (Васілевіч У., с.43).

Пры добрым ураджаі казалі : “На другі Спас і жабрак яблычка з’есць”. Звычай адорваць бедных і маламаёмых людзей яблыкамі і пладамі садоў, акрамя старажытнай народнай традыцыі, быў яшчэ і крытэрыем хрэсціянскай маралі.

Другі Спас – гэта вельмі паважанае хрысціянамі свята “пeратварэнне Хрыста”, аб чым расказвае Евангелле ад Лукі (9:28-36) і Евангелле ад Матфея (17:1-8).

Нягледзячы на тое, што рытуалы другога Спаса атрымалі рэлігійную хрысціянскую афарбоўку, сам вобраз Спаса ў народзе набыў рысы земляроба, які клапаціцца пра свае справы: “Спас не гуляець, каня сядлаець, поле аб’язджаець, копы аблічаець, у гумно вязець”, “Стары Іспас – старэнькі дзядок, на восень садзіў, жыта малаціў”, “Спас ездзець у поле ды зямельку мяшаець, рпыгатаўляець”.

Пачынаючы з другога Спаса, сяляне сеялі азімае жыта, дабаўляюць у насенне зерні зажыначнага снапа.

<u>ТРЦІ СПАС</u> – (малы Спас, хлеб Спас) азначаўся 16 (29) жніўня. Гэта было адно са святаў хлеба, на якое ўжывалі ў розных варыянтах хлеб новага ўраджаю. У хрысціянскія часы зерне і каласкі асвячалі ў царкве. У народзе казалі: “Трэці Спас хлеба прыпас”. Праўда, галоўнае свята ўраджаю адбывалася на дзень раней – на Прычыстую (успленне Багародзіцы, Зялёная, Зельная). Але ў многіх мясцінах Беларусі дажынкі спраўлялі на трэці Спас, гэта можна тлумачыць мясцовымі ўмовамі.

Дажынкі складаліся з наступных фрагментаў: сельскагаспадарчых рытуалаў у полі (завіванне “барады”, прыгатаванне зажынкавага снапа і вянка), шэсце ўдзельнікаў ганаровага жніва ў вёску, віншавання гаспадароў поля з заканчэннем уборкі жыта, святочнага застолля і гуляння.

<u>Трэці Спас</u> – гэта апошні адлёт ластавак, пачатак маладога “бабінага лета” (доўжыцца да 11верасня). Калі маладое бабінага лета было з вятрамі, то чакалі непагадзі і на старое бабіна лета – 1-8 (14-21) верасня. Да ўсіх трох Спасаў на Беларусі прымяркоўвалі правядзенне кірмашоў – штогодніх святочных гандляў з забавамі. На гэтых кірмашах, сярод якіх самым папулярным быў гандаль на другі (яблычны) Спас, прадавалі разнастайныя дары восені (гародніну, садавіну, мёд, хлеб), вырабы рамеснікаў, прамысловыя тавары. У некаторых гарадах і мястэчках спасаўскія штогоднія гандлі праводзілі ў форме кантрактовых ярмарак, дзе збіраліся прадстаўнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заможных колаў для гандлёвых пагадненняў, аптовай куплі і продажу розных тавараў, здачы ў арэнду і продажу маёнткаў і дач.

Штогадовыя святочныя гандлі пачыналіся асвяшчэннем торга святарамі і пад'ёма кірмашовых сцягоў, што азначала пачатак гондлёва-фінансавых аперацый. Спушчаныя сцягі на флагштонах нагадвалі людзям, што сёння кірмаш ужо не працуе. У структуру свята разам з гандлем уваходзілі і з'явы кірмашовага тэатра: тут выступалі скамарохі з мядзведзямі, вандроўныя артысты і цыркавыя калектывы. Напрыклад, на Спасаўскі кірмаш у Мазыры ў сярэдзіне XIX стагоддзя штогод прыязджаў тэатр з Мінска, які паказваў тут свае спектаклі. На На міжнароднай ярмарцы ў Зельве (адбывалася з 20 ліпеня па 20 жніўня штогод і ўключала святкаванне Спаса) працаваў у спецыяльнапабудаваным памяшканні тэатр, дзе выступалі тэатральныя і цыркавыя трупы, ладзіліся танцавальныя вечары, гулялі ў рулетку.

На агульнанародных спасаўскіх кірмашах атрымалі развіццё народныя забавы. Так, у Валожыне існаваў кірмашовы атракцыён "Не ляпніся ў лужу", дзе сродкамі гульні рэалізоўвалі тавар: гулец (заплаціўшы дробязь) з закрытым хустай тварам павінен быў тройчы павярнуцца вакол сябе, прайсці дзесяць крокаў і апусціць рукі на паверхню начовак, якія былі запоўнены вадой з плаваючымі яблыкамі. Калі рукі гульца пападалі на ваду – ён выбываў з гульні, а калі ўдавалася ўхапіць яблык, дык, акрамя яго, гуляючы атрымліваў яшчэ і чарку гарэлкі. Гэтая забава мела не толькі вялікі поспех у сялян, але і прыносіла немалыя прыбыткі арганізатарам. На кірмашах арганізоўваліся таксама выступленні барцоў, вясковых хораў і музыкаў на якія амаль што кожная вёска выстаўляла сваіх асілкаў і артыстаў.

Побач са свецкімі кірмашамі ў Беларусі праводзілі і храмавыя святы з гандлямі ў гонар падзеі, якая датуецца 944г. – днём перанясення нерукатворнага вобраза Спаса – Ісуса Хрыста з Эдэсы ў Канстанцінопаль. Царкоўнае паданне кажа: аднойчы Ісус Хрыстос дзеля вылечвання ад хваробы паслаў Эдэскаму цару Аўгару выяву свайго твара, які цудоўным чынам адлюстроўваўся на палатне. Нерукатворны вобраз доўга захоўваўся ў Эдэсе як мясцовая святыня, затым яго звезлі абрабаваўшыя горад мусульмане. У 944г. Візантыйскія імператары выкупілі святыню ў мусульман. Перавезлі ў Канстанцінопаль і ўрачыста памясцілі ў храм. Гэта адбылося 16 жніўня 944г. і палажыла пачатак святу Спаса на палатне.

Фэсты – храмавыя святы ў гонар Спаса – распачынала святочная літургія ў царкве, затым святары асвячалі гандаль, на якім ужо адбываліся таргі без забаў. Пасля таргоў прыехаўшыя на свята сяляне ішлі ў госці да сваіх родзічаў і знаёмых, якія тут жылі, частаваліся ў застоллі. Моладзь вадзіла вечарынку з танцамі і гульнямі.

На трэці Спас ужо амаль паўсюль пачыналі сяўбу азімага жыта, якую імкнуліся закончыць да 1 (14) верасня – дзень Сімяона Столпніка. Існавала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павер’е, што “Хто да Сямёна пасее жыта, той бедзе з хлебам, а хто пасля – той атрымае дрэнны ўраджай”.

Такім чынам, першае восеньскае свята Спас з’яўляецца старажытным днём грамадскага спажывання новага ўраджаю, якое размяркоўвалася па культурных тэрмінах такім чынам: 1 (14) жніўня – мак, сланечнік, морква; 6 (19) жніўня – садавіна і мёд; 16 (23) жніўня – новы хлеб. Разам з тым Спас быў падрыхтоўкай і часам сяўбы азімага жыта: сяляне асвячалі насенне, праводзілі абрады з мэтай вызначэння хлебароба, які павінен быў пачаць сяўбу. Царква прыстасавала да гэтых святаў гістарычныя і біблейскія падзеі, у выніку чаго старажытныя народныя абрады атрымалі хрысціянскае вытлумачэнне.

Спасаўскія святы вызначаліся вялікімі кірмашамі, украсай якіх былі народныя таленты, палёт творчасці і фантазій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ СВЯТА

Цэнтральная плошча святочна аздоблена. Па ўсяму перыметру шматколернай вясёлкай зіхацяць штандарты і сцягі з выявамі садавіны.

На невялікім узвышшы стаіць упрыгожанае галінкамі і яблыкамі дэкаратыўнае дрэўца яблынькі. Каля яе падножжа – два вулікі, паміж якімі велізарныя букеты палявых кветак. Паабапал яблыні – рады жытнёвых снапоў.

З левага боку ўзвышша размешчана выстаўка “Дары Спаса”, на якую кожная гаспадарка раёна выстаўляе лепшыя экзэмпляры яблык, груш, сліў, снапы азімага жыта, мёд.

З правага боку – выстаўка юнатаў, выстаўка пчаляроў, а таксама конкурсная выстаўка пірагоў з яблыкамі, на якую кожная гаспадарка раёна выстаўляе два пірагі.

На плошчы таксама ёсць гандлёвыя рады і кніжная выстаўка з літаратурай аб садавіне, мёдзе, жыце. У эфіры гучаць беларускія народныя песні і мелодыі.

14 гадзін 00 хвілін

На ўзвышша цэнтральнай плошчы выходзіць юнак у беларускім нацыянальным строі і ўзнімае сурму. Гучаць пазыўныя свята.

На фоне клёката буслоў і шырокай, раздольнай мелодыі цымбал дыктар віншуе ўсіх са святам; харэаграфічны калектыў выконвае танцавальную сюіту “Спасаўскія замалёўкі”, у фінале якой удзельнікі з галінкамі яблынь становяцца ў “яблыневую дарогу”.

Гучыць дыктарскі тэкст аб Спасе – восеньскім свяце, свяце садавіны…

Скрозь “Спасаўскую дарогу” пад гарэзлівы пераззвон цымбал, на плошчу выязджае Восень – сакавітая жанчына ў вянку з хлебных калоссяў, доўгай жоўта-зялёнай вопратцы, упрыгожанай галінкамі, лісцем і пладамі садавіны. Восень едзе на возе, аздобленым садавінай, гароднінай і жытам.

Праехаўшы па плошчы, Восень падымаецца на ўзвышша.

У эфіры гучыць клёкат буслоў. Восень гаворыць аб спякотным леце, калі, дзякуючы руплівай сялянскай працы, насуперак страшнаму сухменню ўдалося ўратаваць на палетках зямныя плады, аб надыходзе самай багатай і шчодрай пары года – восені.

Гучыць жніўная песня, на фоне якой на плошчы адбываецца інсцэнізацыя жніва. Жанчыны выносяць снапы з першымі калоссямі азімага жыта, якое састаўляюць у вялікі першы сноп з левага боку ўзвышша.

На фоне беларускай мелодыі і вершаў пра садавіну на плошчу выходзяць жанчыны з кошыкамі ябляк, груш, сліў, якія ставяць у форме кола з правага боку ўзвышша.

Восень чытае вершы пра свята Спас, пра ўраджай, які вырасцілі жыхары Валожыншчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад гукі гарэзлівай полькі скрозь “яблыневую дарогу” праязджаюць дэкарыраваныя аўтамашыны гаспадарак Валожынскага раёна. На першай машыне – выстаўка садавіны, гародніны, хлебных снапоў, мёду, якія падрыхтавала на свята гаспадарка. Аб’ехаўшы круг па плошчы, машыны спыняюцца за сцэнічным узвышшам.

<u>ВОСЕНЬ:</u> Свята Спасік, пільны часік,
Жытцо возіць, Бога просіць.
- Перанясі, Божа, маё жытцо
пад гумянцо.
А святы Іспас, старэнькі дзядок,
На восень садзіў, жыта малаціў,
Святы Іспас
Яблыкі свенціць,
Ён гнаі возіць,
Жыта пасвяшчаіць.

У эфіры гучаць царкоўныя званы. На плошчы з’яўляецца “яблыневая дарога”, праз якую ідзе хросны ход – Святары з іконамі і ўдзельнікі царкоўнага хору. Прайшоўшы па плошчы, удзельнікі хроснага ходу падымаюцца на сцэнічнае ўзвышша.

Святар гаворыць аб тым, што яблычны Спас – гэта паважанае двунадзесятае свята, у аснове якога – царкоўнае свята Прэабражэнія Гасподня, аб якім расказвае Евангелле ад Лукі і Евангелле ад Матфея. З XV стагоддзя гэта яшчэ і “дзень перамогі хрысціянскай зброі”: 6 жніўня 1456 года армія Магамета II, заваяваўшая Канстанцінопаль у 1453г. і палажыўшая канец Візантыйскай Імперыі, была разбіта пад Белградам венграмі пад кіраўніцтвам Гуніада.

А ва ўсходніх славян гэта быў дзень збору пладоў садавіны, асабліва яблык.

Пачынаецца Спасаўская літургія, святар нагадвае ўсім аб старажытным звычаі памяці продкаў, аб неабходнасці наведаць сёння могілкі і палажыць яблычка кожнаму з сваіх родзічаў.

Хор выконвае духоўныя песні, на фоне якіх святар асвячае снапы жыта, кошыкі з яблыкамі і машыны з сельгаспрадукцыяй.

Восень чытае вершы аб міласэрнасці, аб старажытным жвычаі абдорваць на Спас абяздоленых людзей, аб тым, што сёння на свяце жыхары Валожыншчыны свае лепшыя яблыкі адпраўляюць у дар сіроцкаму дому.

Гучыць музыка. Скрозь “яблыневую дарогу” на плошчы праязджаюць УАЗы з яблыкамі, якія накіроўваюцца ў сіроцкі дом.

Восень чытае вершы пра спасаўскі звычай бонды, калі людзі пладамі зямлі дзяліліся са сваякамі і ўсімі, хто да іх завітаў у госці. І вось сёння багаццем Валожынскай зямлі мы частуем усіх прысутных на свяце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць полька. Дзяўчаты ў беларускіх народных строях (20 чалавек), трымаючы ў руках кошыкі з яблыкамі, грушамі, слівамі, падыходзяць да ўдзельнікаў свята і запрашаюць іх пачаставацца.

Восень чытае вершы пра тое, што Спас – усяму час, пра звычай сяўбы азімага жыта, якое кладзе пачатак будучаму ўраджаю. Прымайце, кіраўнікі гаспадарак Валожыншчыны, элітнае зерне азімага жыта.

На фоне музыкі дзяўчаты прыносяць кіраўнікам гаспадарак кошыкі з зернем.

У эфіры гучыць клёкат буслоў. Восень чытае вершы аб тым, што на Спас буслы адлятаюць у вырай. Ляцяць буслы, несучы на сваіх крылах лета, развітваючыся з роднай зямлёй. Бывай, лета, да сустрэчы. А сёння мы святкуем Спас, на які мы запрасілі гасцей з розных куткоў Міншчыны. Сустракайце фальклорныя калектывы.

На плошчу скрозь “яблыневую дарогу” пад акампанемент уласнай музыкі з песнямі, танцамі выходзяць удзельнікі фальклорных калектываў Мінскай вобласці. Абышоўшы плошчу, яны спыняюцца абапал узвышша.

Адзін з удзельнікаў вітае ўсіх са святам, гаворыць пра тое, што яны з сабой прывезлі не толькі песні і танцы, але і спасаўскія яблычкі сваёй мясцовасці. Прыміце, жыхары Валожыншчыны, яблычкі Мінскай зямлі. Зпрашаем усіх на спасаўскую польку.

Гучыць песня “Полька беларуская”.

Удзельнікі фальклорных калектываў падносяць жыхарам Валожыншчыны яблыкі і запрашаюць іх на польку.

Уся плошча ператвараецца ў вялікую танцавальную пляцоўку.

Восень яшчэ раз вітае ўсіх са святам і запрашае на спасаўскі кірмаш. Пад музыку ўсе разыходзяцца па гандлёвых радах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

1. Берман, И. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе// Записки РГО по отделению этнографии. – Спб., 1873. - кн.5.

2. Васілевіч, У. Беларускі народны каляндар. – Мн., 1993.

3. Горбань, Л.И. Народный календарь погоды. – Киев, 1980.

4. Дембовецкий, А.С. Опыт описания Могилёвской губернии. – Могилёв-на Днепре, 1882. – кн.2.

5. Дзіцячая Біблія. – Стокгольм, 1992.

6. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник. – СПб., 1891, 1894, 1903.

7. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Летне-осенние праздники. – М., 1974.

8. Крачковский, Ю.Ф. Быт западнорусского селянина. – М., 1874.
9. Лозка, А. Беларускі народны каляндар. – Мн., 1993.
10. Неверович, В.А. О праздниках, поверьях и обычаях у крестьян белорусского племени, населяющих Смоленскую губернию// Памятная книжка Смоленской губернии на 1859г. – Спб., 1859.
11. Паўлюкоўскі, У. Народны каляндар. Шлях моладзі. – Вільна, 1934. – кн. 1-13.
12. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. – Вильно, 1912. – Вып. 8.
13. Сержнутоўскі, А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1930.
14. Толстая, М. Полесский народный календарь. Славянское и балканское языкознание. – М., 1986.
15. Фалютынский, К. Народные праздники увеселенья, поверья и суеверные обряды жителей Белоруссии// Вестник Европы. – Спб., 1828. – С.5-6.
16. Этнаграфія Беларусі. – Мн., 1989.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ГУЛЬНЁВАЯ ПРАГРАМА
ЯБЛЫЧНАГА СПАСА

На пляцоўцы, дзе будзе праходзіць свята, стаіць стол, накрыты абрусам, на ім пірог з яблыкамі і розныя стравы, прыгатаваныя з яблык (у тым ліку і цукеркі). Справа і злева стала стаяць дзве яблынькі (бутафорскія). З аднаго боку яблынек – зялёнае лісце, а з другога – яблыкі.

Гучыць вясёлая музыка. Гасцей сустракае жанчына (вядучая), у руках яе кош з прыгожымі, сакавітымі яблыкамі. Яна віншуе ўсіх прысутных са святам садавіны:

Хутка восень – слаўны час,
Прыйшоў на зéмлю – светлы Спас!
Глядзіце, які воз багаты,
Прыехаў сёння ў нашы хаты!

Чаго ў нас толечкі няма,
Што падарыла нам зямля.
А восень поўныя кашы
Духмяных яблык нам дала.

Я бачу, восень, ты не хлусіш –
Чаруюць вока спелыя бакі,
Ах, асалода! Смак, калі адкусіш!
А-ну, бліжэй! Каштуйце землякі!!!

ВЯДУЧАЯ: Кажуць, што добра яблычка да Іспасу. Таму з сённяшняга дня, пажадана, каб на вашым стале заўсёды былі яблыкі. Дзякуючы ім, мы забяспечваем сябе вітамінамі на цэлы год! Яны вельмі карысныя і смачныя сырыя, але з іх можна прыгатаваць і шмат розных страў. Напрыклад: яблыкі ў грылляжы, у жэле, з творагам, з вяршкамі і г.д. А якія смачныя атрымоўваюцца з іх цукеркі: “Месячныя каменьчыкі”, “Рахалі”, “Студэнцкія” і яшчэ многа розных дэлікатэсаў.

Паважаныя гаспадынькі, а што яшчэ можна прыгатаваць з яблык? Можа, у вас ёсць свае сакрэты, падзяліцеся з намі, калі ласка. Той, хто прапануе самы цікавы рэцэпт, будзе ўзнагароджаны яблычным прызам.

*/Праводзіцца конкурс на самы лепшы рэцэпт. Пераможца ўзнагароджваецца пірагом з яблыкамі, а ўсе астатнія – яблычнымі цукеркамі. У гэты час вядучая паведамляе:*

Яблычкі яшчэ шырока выкарыстоўваюць у лячэбных мэтах. Салодкія сарты прымяняюць пры захворванні пячонкі, сардэчна-сасудзістай сістэмы, а кіслыя – пры цукровыя дыябеце. У народнай медыцыне кашыца са свежацёртых яблык прымяняецца як зажыўляючы сродак пры драпінах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скуры. Спрыяльна ўздзейнічаюць на самаадчуванне разгрузачныя яблычныя дні.

Хто хоча атрымаць яблычка – наліўное, сладкае? Для гэтага вы павінны назваць летнія сарты яблык.

*/адказ: белы наліў, мелба, папінаўка…/*

А якія вы ведаеце асеннія сарты?

*/адказ: манцэт, красуня саду, слава пераможцам, непараўнальная, усмешка восені і г.д./*

Якія сарты яблык належаць да зімніх і познезімніх?

*/беларуская-малінавая, жыгулёўская, беларускі сінап, лімонная, уэлсі, мінская, норыс, суворавец, палеская…/*

*Той, хто называе сорт, атрымлівае яблычка. Усіх, хто атрымаў яблык, вядучая запрашае на пляцоўку.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> Ёсць народная прымаўка: “Сад пасадзіць нікаму не рана і не позна, ні малому, ні старому”. Яблыневыя сады радуюць нас вясной сваёй пышнай квеценню, а восень мы не ўяўляем без шчодрых яблык, без гэтых духмяных і сакавітых пладоў. Яблыня, бадай, адзіны від садавіны, які нават у неспрыяльных умовах дае багаты ўраджай.

Зараз мы з вамі і будзем садзіць сад.

*/Усіх, хто знаходзіцца на пляцоўцы з яблыкам, вядучая дзеліць на дзве каманды/.*

*Гульня праводзіцца ў два этапы.*

*<u>Першы этап.</u> “Пасадка саду”.*

*Першыя ўдзельнікі каманд падбягаюць да бутафорскіх яблынь і ставяць іх на крыж. Другія ўдзельнікі рыдлёўкамі “ўзрыхляюць глебу” вакол яблынь, трэція паліваюць дрэўцы вадой з палівалкі. Чацвёртыя – беляць камель. Пятыя – выконваюць ролю пчолкі – “апыляюць” – абягаюць вакол дрэўца. Шостыя пераварочваюць дрэўца тым бокам, дзе вісяць яблыкі.*

*<u>Другі этап.</u> “Збор яблык”.*

*Першыя ўдзельнікі каманд падбягаюць да сваіх яблынь, зрываюць па яблыку, вяртаюцца і кладуць у свій кош. Другія ўдзельнікі робяць тое ж самае. І так да той пары, пакуль на дрэўцах не застанецца ніводнага яблыка. Пераможа тая каманда, якая першая збярэ яблыкі ў свой кош.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> А зараз успомніце, калі ласка, якая сувязь паміж яблыкам і навукай? Усім вядома, што вялікі вучоны Ньютон адкрыў закон сусветнага цягацення. Што дапамагло яму адкрыць гэты закон?

*/адказ: Ньютон сядзеў у садзе пад яблыняй. Упаўшы на яго яблык дапамог адкрыць закон сусветнага цягацення/.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> Успомніце, у якім старажытным міфе ўпаміналася яблыка раздору?

*/адказ: у старым грэчаскім міфе сказана, што на вясельны пір багоў не запрасілі багіню раздору – Эрыду. За гэта яна падкінула багіням залатое яблычка з надпісам “прыгажэйшай”. Багіні Гера, Афіна і Афрадзіта сталі прэтэндаваць на званне “прыгажэйшай”. Царэвіч Парыс аддаў гэтае званне Афрадзіце, таму што яна абяцала яму самую прыгожую жанчыну Елену. У выніку багіні перасварыліся і дзве, што засталіся без яблыка, пакляліся адпомсціць Парысу. Афрадзіта, выконваючы сваё абяцанне, дапамагала Парысу выкрасці Елену. Але ў Елены быў ужо муж. Гэты выпадак і стаў прычынай вайны паміж грэкамі і траянцамі/.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкажыце, калі ласка, у якіх літаратурных творах яблыка таксама адыграла вялікую ролю?

*/адказ: у творы А.С. Пушкіна “Сказка о мёртвой царевне и семи богатырях”; у драме Фрыдрыха Шылера “Вільгельм Тэль”, дзе расказваецца аб барацьбе швейцарцаў за сваю незалежнасць. Намеснік імператара загадаў на людным месцы, на шосту, павесіць свой капялюш з тым, каб кожны прахожы здымаў свой капялюш і станавіўся перад яго капелюшом на калені. Адзін паляўнічы Вільгельм Тэль адмовіўся выконваць гэты загад, за што яму пагражала смерць. Але намеснік абяцаў памілаваць яго, калі той выстралам з лука саб’е яблыка з галавы сямігадовага сына. Паляўнічы яблык збіў, а затым стралой прабіў сэрца намесніка імператара. Гэта стала сігналам да паўстання швейцарскага народа/.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> Можа, у прысутных ёсць жаданне паспрабаваць збіць стралой яблык з капелюша?

*/Праводзіцца гульны “Збі яблык”/.*

*Умовы гульні: на капялюш, які ляжыць на стуле, кладуць яблык. Жадаючыя павінны збіць яго пры дапамозе дзіцячага арбалета. Шчаслівычыкі ўзнагароджваюцца падарункамі.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> У музыцы яблыка таксама пакінула свій след. Дзе менавіта? У якіх музычных творах?

*/адказ: Расіні – опера на сюжэт Шылера “Вільгельм Тэль”;*
*Глюк – опера “Парыс і Елена”;*
*Берліёз – оперная дылогія “Траянцы”/.*

А якія вы ведаеце песні пра яблыню?

*/Вядучая прапануе выканаць усім прысутным найбольш вядомую песню/.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> Вы ўсе ведаеце, што яблык стаўся прычынай раздору паміж богам і людзьмі, якія адведалі яблык з дрэва пазнання.За гэта бог выгнаў іх з раю. Што гэта за людзі?

*/адказ: Адам і Ева/.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> А цяпер адкажыце, на што падобная палова яблыка?

*/адказ: на другую/.*

*<u>Гульня “Знайдзі сваю палову”.</u>*

*Кожны ўдзельнік атрымлівае палову яблыка. Задаса – знайсці сваю палову. Той, хто гэта зробіць першы, атрымлівае ўзнагароду і пацалунак ад партнёра.*

*/Гучыць музыка, усё запрашаюцца на карагод “Яблынька”/.*

<u>ВЯДУЧАЯ:</u> Яблыкі садовыя,
Яблыкі мядовыя,
Усе наліўчатыя,
Усе рассыпчатыя –
Грушавыя, ананас,
Набірайце пра запас!

Частуйцеся, калі ласка!

*/Вядучая частуе ўсіх прысутных яблыкамі, жадае ім здароўя, шчасця, добрага быту/.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ

### СПАСАЎСКАЯ ПРЫСУШКА

Пакласці пад паху яблык і пайсці з ім слухаць набажэнства, тое самае зрабіць на другі і на трэці дзень. Той яблык даць з’есці таму, каго кахаеш.

### ЗАГАДКІ

1. Чырвоныя, духмяныя
Расцём мы на галінах.
І нас смакуюць хлопчыкі,
І любяць нас дзяўчынкі.
(яблыкі)

2. Мы зыркія ліхтарыкі.
(яблыкі)

3. Чырвоны Піліп да палкі прыліп.
(груша)

4. Жоўтая, на лямпачку падобная, але салодкая і соку поўная.
(груша)

5. Пад адным брыльком семсот казакоў.
(мак)

6. Поўна дзешка круп, а наверсе струп.
(мак)

7. У цёмнай цемнатушачцы сядзяць чарнушачкі
І вяжуць вязаначкі – ні вузла, ні пяцелькі.
(пчолы)

### ПРЫМАЎКІ І ПРЫКАЗКІ

- Дзе кветка, там і мёд.
- На што мне яго мёд, калі ён сам мне горкі.
- Пчолкі па адной не селяцца.
- Працуе, як пчолка.
- Працаваць не хоча, а на мёд ахвочы.

### ЛЕГЕНДА

Ішоў неяк святы Спас па бяскрайнему мору. Ідзе сабе ды навокал паглядае, дзе б што да парадку прывесці. І раптам бачыць: сярод бяздоннага мора – агромністы шэры камень, на самай вяршаліне сядзіць дзяўчына

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгажосці незвычайнай. Прыглядзеўся святы Спас – плача прыгажуня горкімі слязьмі.

- Чаго ты плачаш? – запытаўся Спас.

Дзяўчына сцішылася і распавядала, як пакрыўдзіў яе адзін з апосталаў – Пётр. Калі Бог вучыў, як ствараць боскіх істот – пчолак, то апостал не даваў ёй уважліва слухаць, што да чаго, спрабаваў жартаваць з красуняй, лез абдымацца. Вось з-за гэтага яна нічога і не чула ў павучаннях бога. Таму і ўцякла як мага далей ад вачэй людскіх, каб ніхто не здагадаўся аб яе скрусе. Як жа ёй не ліць слёзы, калі яна не здолее выканаць боскую волю.

Расказала пра ўсё дзяўчына і зноў заплакала.

- Не плач, прыгажуня, гэтым справу не паправіш. Што-небудзь зараз прыдумаем, каб не пагнявіць усевышняга.

- Што рабіць, калі слёзы самі з вачэй коцяцца, - адказала, усхліпваючы, дзяўчына.

- Калі так, то слухай, што скажу, і няхай так збудзецца воля божая: кожная слязінка з тваіх вачэй будзе той самай боскай істотай – пчолкай, а кожная пчолка снародзіць мноства гэткіх жа істот…

Градам сыпанулі слёзы па твары дзяўчыны, і яна ўжо не выцірала іх, а яны ператвараліся ў залаціста-агністых пчолак, якія весела кружыліся навокал.

Святы Спас спытаў: “Чаго ж яны толькі тут лятаюць, нікуды не падаюцца?” – “Таму што матку кожнай сям’і трэба стварыць, тады кожны рой асобна будзе жыць і паляціць, куды захоча”, - адказала дзяўчына.

…І яна працягвала плакаць.

Гледзячы на яе, і сам Спас праслязіўся. Падумаў: “Няхай сярод слёзак прыгажуні і некалькі маіх будзе”. Толькі так падумаў, як яго слёзы сталі ператварацца ў пчол-матак. Вось адкуль, гавораць, пчолы на зямлі з’явіліся.

АЎКЦЫЁН

1. Ці можна па паводзінах пчол вызначыць, якое будзе ў бліжэйшы час надвор’е?

Адказ: - Калі пчолы моцна гудзяць – будзе яснае надвор’е.

- Калі пчолы злыя, забіваюць чужых пчол – будзе засуха.

- Пчолы вяртаюцца ў вуллі ў ясны дзень – будзе навальніца.

- Пчолы роем уюцца пад квітнеючай чаромхай – к добраму яснаму надвор’ю.

- Пчолы не адлятаюць далёка ад вулляў – будзе хутка дождж…

2. На талерку кладуць папярэдне ўзважанае яблыка. Задача прысутных – адгадаць, колькі яно важыць.

- Колькі важыць самы вялікі яблык?

- Колькі важыць самы малы яблык?

3. Выносіцца кош з яблыкамі. Прысутныя павінны адгадаць іх колькасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Вядучы дастае з меха літары, напісаныя на паперы. Прысутныя называюць сарты яблык, назвы якіх пачынаюцца на паказаную літару.

ГУЛЬНІ

"Прынясі яблык"

З жадаючых прыняць удзел у гульні фарміруецца дзве каманды па 4-6 чалавек у кожнай.

Удзельнікі кожнай групы па адным – з драўлянымі лыжкамі ў руках бягуць да стула, які стаіць на адлегласці 5м ад каманд, і без дапамогі рук кладуць яблык на лыжку. Затым кожны вяртаецца да сваёй каманды, перакладае свой яблык у лыжку другога ўдзельніка, а сваю лыжку перадае трэцяму ўдзельніку. Другія ў гэты час бягуць з яблыкам да стула, абягаюць яго і, падбегшы да сваёй каманды, перакладаюць яблык наступным удзельнікам. Гульня працягваецца да той пары, пакуль яблык не апыніцца ў апошняга ўдзельніка, які кладзе яблык на стул. Каманда, якая раней гэта зробіць, і будзе пераможца.

"Мак"

Дзеці выбіраюць дзяўчыну альбо хлопчыка макам, самі становяцца вакол "маку", бяруцца за рукі, ходзяць кругом і спяваюць:

А на гарэ мак, мак,
На даліне мак, мак.
А вы мае маковачкі,
Ці паспеў мак?

"Мак" адказвае: "Паехалі араць".

Прыпеўка з тым жа пытаннем паўтараецца некалькі разоў, а "мак" па чарзе адказвае: "Пасеялі", "Узышоў", "На цвет залажыў", "Расцвітае", "Спее"… Як скажа "мак", што ён паспеў, усе дзеці падбягаюць да яго і тармосяць.

## СТРАВЫ З ЯБЛЫК

### Яблачная салата з кефірам

400г. яблык, шклянка кефіру, ст. лыжка мёду, 100г. здробных арэхаў.

Яблыкі ачысціць ад шалупіння і сарцавіны, нарэзаць тонкімі скрылёчкамі. Кефір з мёдам узбіць да густой пены, заліць атрыманай масай. Яблыкі пасыпаць арэхамі.

### Салата пікантная

Два памідоры, яры яблыкі, адна цыбуліна, два марынаваныя агуркі, адзін стручок салодкага перцу, адна чайная лыжка хрэну ў ******, зяляніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Яблычна-капусная салата

400г. яблык, 500г. белакачаннай капусты, цукар, лімонны сок, алей, 2 яйкі, цыбуліна, кмен.

Капусту тонка нашыткаваць, яблыкі нацерці на тарцы, пакрышыць цыбулю, дадаць усё астатняе і перамяшаць. Вылажыць у міску, упрыгожыць скрылёчкамі зваранага ў крутую яйка, пасыпаць кменам.

## Яблычная салата з агуркамі

200-250г. яблык (салодкіх), 2-3шт. салёных агуркоў, цыбуліна, 2ст. лыжкі алею, крыху воцату.

Яблыкі нацерці на тарцы, агуркі, ачысціўшы ад зёрнеў, нарэзаць кавалачкамі ў форме кубікаў, цыбулю пакрышыць. Усё перамяшаць з воцатам і алеем. Замест масла можна выкарыстоўваць маянэз.

## Яблыкі фаршыраваныя морквай

3-4 яблыкі, 200г. морквы, лімон, 10г. алею, 20г. мёду, 30г. салёных агуркоў, крыху перцу, зяляніны.

Яблыкі памыць, дастаць сарцавіну і частку мякаці, затым яблыкі бланшыраваць, разрэзаць напалам і папрыскаць лімонных сокам.

Моркву ачысціць, нацерці на дробнай тарцы, і перамяшаць з астатнімі прадуктамі. Папоўніць яблыкі падрыхтаванай морквай. Упрыгожыць зялянінай.

## Яблычны пірог з мёдам

Для яго прыгатавання неабходна: 150г. мёду, 500г. яблык, шклянка цукру, два яблыкі, 100г. сметанкавага масла, паўтары шклянкі пшанічнай мукі, палова чайнай лыжкі пітной соды.

У разагрэты алей дабаўляюць вадкі мёд, яйкі, цукар і старанна ўзбіваюць. Затым, перамешваючы, паступова дабаўляюць муку і соду. Яблыкі разразаюць на невялікія скрылёчкі але без сарцавіны, перамешваюць з цестам і выкладваюць у форму, добра змазаную сметанкавым маслам. Прыпякаюць у духавой шафе пры тэмпературы 170º.

## Яблычныя цукеркі “шарыкі”

0,5кг яблык, 200г. цукру, 100г. апельсінавай цэдры, 50г. арэхаў і вафля.

Ачышчаныя ад скуры яблыкі нарэзаць на маленькія кавалачкі, абсыпаць цукрам і пакінуць на 2-3 гадзіны пры пакаёвай тэмпературы. Пасля паяўлення вадкасці яблыкі варыць 25-30 хвілін, увесь час памешваючы, пакуль не загусцее. Пад канец варкі усыпаць апельсінавую цэдру, надраную на тарцы і дробныя арэхі. Лыжкай зрабіць шарыкі і абваляць у крыганых вафлях. Ахаладзіць. Гатовыя цукеркі выкласці ў папяровыя формачкі.

## Яблычныя цукеркі “месячныя каменьчыкі”

100г. сушоных яблык без скуры, 50-100г. арэхаў, 200г. цукру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яблычныя скрылёчкі разрэзаць на дзве-тры часткі, арэхі здрабніць, цукар падсмажыць на сухой алюміневай патэльні, усевь час памешваючы драўлянай лапаткай, пакуль не стане цёмна-жоўтым.

Падрыхтаваныя яблыкі і арэхі перамяшаць, высыпаць у кіпячы цукар і, памешваючы лапаткай, варыць яшчэ 2-3 хвіліны. Гарачую масу выліць у змазаную маслам місу ці на марвуровую дошку. Калі маса стане цвёрдай, парэзаць на невялікія кавалачкі. Цукеркі пакласці ў салафанавыя мяшкі і паставіць у сухое месца.

ГУЛЬНЯ “У ВАРТАВОГА”

У круг сталі, адзін аднаму рукі далі.Круг – гэта сад. У садзе ёсць вартавы. Вось ён. Але заспаўся, небарака! А тым часам нехта яблычкамі паласаваўся. Трэба дапамагчы вартавому злодзея знайсці! Пойдзем па крузе са словамі:

Вартавы, пакуль ты спаў,
Нехта яблычкі пакраў!
Ты па садзе пахадзі,
Злодзея хутчэй знайдзі!

Вартавы, не расплюшчваючы вачэй, ходзіць па “садзе”. Затым спыняецца і дакранаецца да каго-небудзь рукой. Злодзей схоплены. Калі гэта хлопчык і дзяўчынка – то яны цалуюцца, а калі два хлапцы ці дзве дзяўчынкі – то яны танцуюць.

Я. Колас
БАЙКА

“Першая пара і першая кара”
Паміж Тыграм і Еўфратам –
Так мы ў бібліі чытаем –
Насадзіў Бог сад багаты,
Ды назваў той сад ён раем.
Усялякіх там жывёлін
У тым садзе ёсць даволі –
Шчыплюць траўку паміж дрэў.
Бог прывёў Адама й Еву
У рай, ды кажа:
“Вось вам, дзеці,
Тут садзіцеся й жывіце!
Тут яды вам ёсць да чорта:
Вось антоны, вось апорты,
Вось і слуцкія вам бэры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тут вісяць, нібы збаны,
Адным словам, тут без меры
Рознай ёсць садавіны.
Не лянуйся, не ляжы –
Еж – хоць пуп расперажы.
Толькі вось чаго не ежце –
Ані яблычка, ні звання –
З дрэўца зла й дабра пазнання,
Так і з яблыні жыцця".
Так сказаўшы, бог пайшоў,
А цётка Ева, вось цікаўнаю была,
Падышла, як бач, да дрэва,
Да дабра пазнання й зла.
На тым дрэве сядзеў змій,
А ў тым змію сядзеў д'ябал,
Той да Евы: "Слухай, баба,
Чаму яблык не ясі?
Ты не бойся, з'еш вазьмі
Ды Адаму занясі.
Што ад Бога забарона?
Вось варона ты, варона,
Вы дурней малых дзяцей,
Бог хітруе перад вамі,
Бо калі вы з'ясцё яблык гэткі –
Самі станеце багамі,
Запануеце над светам!
Рві ды еж – вось мой адказ!"
Ева тут за яблык – цап,
Есць сама, частуе мужа –
Спадабаўся яблык дужа,
А тут раптам Бог з-за куста
Як гукне: "Гоп-гоп, Адам,
Дзе ты дзеўся, вось брыда!"
Той, запхаўшы рот агрызкам,
У адказ: "Я тут, я блізка!"
- А чаго ж забраўся ты
З цёткай Евай у кусты?
Вось я толькі тут дзіўлюся.
- Божа, я цябе баюся,
Чую, Божа, я твой гнеў.
- Бо ты мусіць яблык з'еў
З забароненага дрэва?
- Еў, ды я не вінаваты,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спакусіла мяне Ева,
Тая вось, што ты мне сватаў!
- А, дык гэта ты, заразе
Усяе бяды прычына, - Наваліўся Бог адразу
На змярцвелую жанчыну.
Тая адказала ў міг:
- Мяне змій угаварыў,
А ты ж сам яго стварыў.
І па-мойму, гэтак сама,
Ну не ў чым вініць Адама,
Змія, Еву, усіх траіх?
Бо сам Бог стварыў жа іх.
Ён жа ведаў загаддзя.
Хто і што рабіць з іх будзе,
Ды людзей нявінных судзіць
Я б сказаў, бесчалавечна:
Цяжкай катаргаю вечнай
Пакараў стары Адама,
Еву знаў жа – гэтак сама,
Ён сказаў, што ўсе жанчыны
Будуць служкамі мужчыны
І раджаць хоць будуць з болем –
Не адмовяцца ніколі.
Змія ён пракляў патом
Вечна поўзаць жыватом,
Вечна землю толькі ессці.
Скончыў Бог той суд нарэшце
Ды й прагнаў людзей ён з рая –
Вось за яблык як карае!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Песня

У садочку яблынька
Стройная расла.
Як нявеста-павачка,
У квецені была
Верныя сябровачкі
З яблынькай раслі,
Ад вятроў, мяцеліцы
Сэрца бераглі.

Побач, на аселіцы,
Зграбны вырас клён.
У красуню-яблыньку
Закахаўся ён.
Дзівіцца-любуецца
З ранку да цямна:
Самая прыгожая
Між усіх яна.

Чуе, чуе яблынька,
Клён шапоча ёй:
“Будзем разам, любая,
Мы заўжды з табой!”
З той пары ўсе ведаюць
Пра каханне іх.
Віншавала сонейка
Ўранку маладых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА

У.А. Васілевіч – “Дай божа знаць, з кім век векаваць”, Мінск, 1993г.

А. Захарава – “Яблоко”, Мінск, 1991г.

В.Э. Шамадзі,
В.А.Санько – “Разговор с природой”, Мінск, 1990г.

Л.В. Волкава – “Вечера и дни отдыха в клубе”, Расія, 1986г.

Л.А. Дазорцава – “Садоводу-любителю”

А.М. Ненадавец – “Святло таямнічага вогнішча”, Мінск, 1993г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ

1. Спас на Беларусі……………………………………………..с. 3-8

2. Урачыстае адкрыццё свята…………………………………..с. 9-12

3. Гульнёвая праграма яблычнага Спаса………………….с.13-15

4. Дадатковы матэрыял………………………………………...с.16-23

5. Выкарыстаная літаратура………………………………..с.24

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ